Газета заснавана ў 1938 годзе. Адноўлена ў 1997 годзе.

МАСАВА-ПАЛІТЫЧНЫ ШТОТЫДНЁВІК

Газета Слонімская

№12 (354) 18 — 24 сакавіка 2004 г. Наклад 10.550 экз. Кошт у розніцу свабодны

«ГАЗЕТУ СЛОНІМСКУЮ» ЧЫТАЮЦЬ Слонім, Зэльва, Дзятлава, Масты, Ваўкавыск, Шчучын, Ліда, Гродна, Баранавічы, іншыя гарады Беларусі, а таксама на HTTP://gs.promedia.by

ВТОРОЙ СРОК ПУТИНА — ВТОРАЯ ПОРЦИЯ КОТЛЕТ С МУХАМИ

Счет выборов в России — более 70% у Путина против неполных 14% у главного соперника — напомнил итоги голосования у нас в 2001 году. В ночном эфире "Свободы слова" на НТВ даже прозвучало с горечью: мы пришли к белорусскому варианту!

■ Россияне выбирали президента, а мухи на котлетах достанутся Беларуси...

Действительно ли — как с гордостью отмечают государственные мужи в Минске — Кремль все больше копирует белорусскую модель авторитаризма? И если да, то почему тогда отношения двух лидеров чем дальше, тем хуже? Одноименные заряды отталкиваются — или все же есть иные факторы противоречий, порой уже приобретающих черты антагонизма?

Наконец, чего ждать Беларуси от второго путинского срока?

Андрей Федоров, эксперт Международного института политических исследований, отметил в интервью *"Белорусским новостям"*, что высокий результат действующего президента России по итогам голосования 14 марта в основном обеспечен в предвыборный период. То есть — вряд ли уместно говорить о каких-то масштабных фальсификациях. *"Можно спорить о степени корректности тех политтехнологий, что применялись командой Путина, но, по крайней мере, не было прямого обмана"*, — говорит Андрей Федоров.

Подобной точки зрения придерживается другой известный белорусский политолог — Виталий Силицкий. *"Если Россия и пришла к белорусскому варианту, то это пока — вариант 1994 года. Тогда Лукашенко тоже победил с разгромным счетом, но при этом — выиграл честно"*, — заявил Виталий Силицкий *"Белорусским новостям"*.

При этом наши эксперты отмечают, что в своих высказываниях программного характера на пресс-конференции в ночь на понедельник Владимир Путин декларировал лозунги, невообразимые в устах его белорусского коллеги.

Переизбранный кремлевский лидер говорил о задачах развития подлинной многопартийности, становления гражданского общества, обеспечения свободы СМИ. Одним из ключевых было слово "модернизация", в то время как Александр Лукашенко исповедует "здоровый консерватизм" и приказывает достичь в тех или иных сферах — от сельского хозяйства до образования — уровня советских времен.

По мнению Виталия Силицкого, ставить знак равенства между российской и белорусской моделями не позволяет целый ряд заметных отличий. В российском варианте дается куда больше простора плюрализму, политической конкуренции. Заметьте, что в ночь после выборов выходы в прямой эфир главы ЦИКа Вешнякова перемежались с передачей Савика Шустера на НТВ, в которой эти же "выборы без выбора" подвергались беспощадной критике. Надо ли говорить, как контрастирует это с белорусскими реалиями?

Эксперт *"Белорусских новостей"* высказал также мнение, что нынешние авторитарные тенденции в России не в последнюю очередь обусловлены и бездарной линией тамошних демократов, дискредитацией либеральных идей.

Продолжение материала читайте на 2 стр.

ГОРАД

РЫНКАЎ У СЛОНІМЕ СТАЛА БОЛЬШ

■ Мікола КАНАНОВІЧ

10 сакавіка адбылося ўрачыстае адкрыццё новага рынка ў мікраРаёне Дружба (Энка) у Слоніме. Гаспадар рынка — таварыства з абмежаванай адказнасцю "Партнёр-Слонім".

Старшыня райвыканкама Мечыслаў Касцюк, які прысутнічаў на мерапрыемстве, сказаў, што ён становуча ацэньвае адкрыццё новага аб'екта ў нашым горадзе. "Як бы там ні было, а адкрыццё рынка — гэта новыя дадатковыя працоўныя месцы. Вядома, асноўную ацэнку работы новага прадпрыемства з часам зробяць самі слонімцы. Я спадзяюся і думаю, што ацэнка будзе станоўчай", – зазначыў Мечыслаў Касцюк. Ад імя ўладаў старшыня райвыканкама падзякаваў гаспадару новага рынка ТАА "Партнёр-Слонім" за ідэю будаўніцтва рынка, "Аграпрамбудбанку" за фінансаванне праекта і падрадчыкам за выкананыя работы.

Дырэктар ТАА "Партнёр-Слонім" Сяргей Салавей, у сваю чаргу, дзякаваў за падтрымку мясцовым уладам, упраўляючым абласнога і слонімскага аддзяленняў "Аграпрамбудбанка" за тое, што яны зразумелі неабходнасць фінансавання праекта і пайшлі насустрач, а таксама будаўнікам за іх працу. Дырэктар зазначыў, што ў поўным аб'ёме работы яшчэ не завершаны, але асноўныя аб'екты ўжо гатовы да працы, а з часам зробяць усё астатняе і тэрыторыя рынка пашырыцца.

Калі чырвоную стужку перарэзалі і ўсе зайшлі ў памяшканне, спадарыня Жанна Скок на правах гаспадыні правяла экскурсію для гасцей і журналістаў. Паказаць было што: каўбасны зал, зал для продажу мяса, мясных і субпрадуктаў, міні-кафэ, бюро банкаўскіх паслугаў (абмен валюты, камунальныя плацяжы і іншае), аддзел малочных прадуктаў і сыроў, кабінет адміністрацыі, гандлёвы зал для продажу садавіны і гародніны, ветэрынарная лабараторыя і дапаможныя памяшканні — усё выканана ў еўрастылі і абстаўлена па апошнім слове тэхнікі. На трыццаці гандлёвых месцах у будынку стаяць звышдакладныя электронныя вагі. На вуліцы плануецца размясціць 150 гандлёвых месцаў. З часам у эксплуатацыю здадуць двухпавярховы будынак для гандлю прамысловымі таварамі. З нагоды адкрыцця свайго прадпрыемства гаспадары частавалі гасцей шампанскім і цукеркамі. А першых пакупнікоў чакалі ў пятніцу, 12 сакавіка. У гэты дзень, праўда, там працавалі толькі два гандлёвыя месцы ў каўбасным зале.

Такім чынам, з адкрыццём новага рынка ўсяго ў Слоніме іх цяпер стала тры. Але такая колькасць прапрымаецца хутчэй за ўсё нядоўга. У горадзе ходзяць размовы пра хуткае закрыццё рынка на Брэсцкай вуліцы. Да таго ж гаспадару гэтага рынка мясцовы цэнтр гігіены і эпідэміялогіі вынес прадпісанне ліквідаваць да 1 траўня шэраг недахопаў. Выканаць некаторыя пункты гэтага прадпісання (напрыклад, усталяванне каналізацыі) практычна немагчыма. На рынку райспажыўсаюза на вуліцы Савецкай плануецца завяршыць будаўніцтва памяшкання крытага рынка. Толькі пакуль не вядома, калі і за якія сродкі тое зробяць. Выходзячы з цяперашняй сітуацыі з рынкамі ў горадзе можна меркаваць, што новы рынак на Энцы ў хуткім часе набярэ гандлёвыя абароты. ■

Фота Таццяны ПЛАХЕТКА

■ Чырвоную стужку перараэае старшыня райвыканкама

ЗДАРЭННЕ

ПАЙШОЎ ПАД ЛЁД

14 сакавіка ў раёне Баранавіцкага моста пры пераходзе канала Агінскага пад лёд праваліўся невядомы мужчына.

Па словах відавочцаў здарэння, мужчына на выгляд меў 50 гадоў, быў апрануты ў вайсковы бушлат. Пацярпелы крычаў і клікаў на дапамогу, пакуль не схаваўся пад лёдам.

Работнікі міліцыі звяртаюцца з просьбай да ўсіх, каму штонебудзь вядома пра асобу пацярпелага, паведаміць у райаддзел міліцыі (тэл. 2-56-36 альбо 02).

Мікола КАНАНОВІЧ

«01» СООБЩАЕТ

ОГОНЬ ЖЕСТОК

За прошлую неделю (8—14 марта) в Слонимском районе произошло 2 пожара.

Так, 9 марта в деревне Мельканович по ул. Мелешко, 8 по причине короткого замыкания электропроводки вспыхнул автомобиль «Опель-Омега», принадлежавший В.Цвикевичу. В результате пожара огнем повреждены автомобиль и гараж, в котором находилась иномарка.

В этот же день произошел пожар в жилом доме И. Жилинского. Причиной пожара стало неосторожное обращение с огнем — сам хозяин курил в постели.

С начала года в Слонимском районе зафиксировано 20 пожаров, в огне погибло 3 человека. Ущерб от пожаров составил около 49 млн. рублей.

Юрий БУЛЫКА

ИХ ВЫБОР

ВТОРОЙ СРОК ПУТИНА – ВТОРАЯ ПОРЦИЯ КОТЛЕТ С МУХАМИ

Продолжение. Начало на 1 стр.

"Многие из представителей, условно говоря, прогрессивного лагеря целое десятилетие паразитировали на административном ресурсе. Это привело к деградации и саморазрушению демократической среды", — считает Виталий Силицкий.

Он также замечает, что Конституция 1993 года, давшая Ельцину, а затем Путину царские полномочия, во многом была продавлена усилиями близких к власти российских либералов. Теперь они кусают локти.

Политолог саркастически добавляет, что *"российские протагонисты демократической идеи оказались не менее бездарными, чем их белорусские собратья"*.

Собеседник *"Белорусских новостей"* соглашается: да, лозунги модернизации в устах официального лидера России – это уже немало. Если учесть, какие мощные рычаги для реализации избранного курса имеет хозяин Кремля.

Но в этом же, по мнению наших экспертов, кроется и опасность. *"Ведь государственный курс держится на милости одного человека, можно сказать – на царской милости*, – отмечает, в частности, Виталий Силицкий. – *Благо, что в России сегодня просвещенный царь..."*

Касательно перспектив отношений между Москвой и Минском политолог Андрей Федоров прогнозирует: притом что Кремль воздержится от резких шагов, давление на Беларусь будет нарастать. Прагматик Путин ставит во главу угла, естественно, не чаяния белорусских демократов и адептов независимости, а российские интересы. Они же сегодня трансформируются в политику привязки постсоветских стран к Москве – политику, получившую в кругу тамошних аналитиков название "операции СНГ".

В рамках этой "операции" не исключен и вариант инкорпорации Беларуси. Во всяком случае, по мнению экспертов *"Белорусских новостей"*, будет продолжаться латентная экономическая экспансия, грозящая поставить нашу страну на грань потери независимости.

Наверняка, считает Андрей Федоров, в Кремле найдется кому заниматься и – назовем это так – мероприятиями в плане поиска устраивающей российские элиты кандидатуры на смену первому белорусскому президенту.

По мнению Андрея Федорова, *"поддержка идеи третьего срока Александра Лукашенко, мягко говоря, маловероятна"*.

В свою очередь, политолог Виталий Силицкий подчеркивает: при всех поворотах газового вентиля Кремль в целом по отношению к Беларуси пока ведет политику "в белых перчатках". Если же в 2008 году преемником Путина станет некто вроде бестрепетного силовика Сергея Иванова – эти белые перчатки могут оказаться в мусорной корзине кремлевского кабинета.

Короче, в Минске самое время осознать, что политика отделения мух от котлет будет только крепчать. Так что надо поскорее выбросить на историческую свалку проект союзного государства и – заниматься нормальным обустройством собственной страны. Равно как и обустройством полноценных межгосударственных отношений с Россией.

К словам экспертов *"Белорусских новостей"* остается добавить лишь один вопрос. А дальновидна ли радость в высоких минских кабинетах по поводу того, что Путин-де копирует "наши" методы руководства? Ведь фирменное отличие белорусского стиля – это безжалостное подавление политических оппонентов.

А ну как Владимир Владимирович возьмет да и применит к дерзкому вчерашнему союзнику, ставшему вдруг в оппозицию к Кремлю, приемы типа тех, которыми белорусские власти утюжат свою внутреннюю оппозицию? Мало ведь не покажется.

Александр КЛАСКОВСКИЙ

●●● ИНФОРМАЦИЯ ●●●

СЛОНИМСКИЙ РЫНОК
ЦЕНЫ НА ПРОДУКТЫ
16.03.2004 г.

Наименование	Цена за 1 кг
Молоко (1 л)	600 руб.
Творог	3 000 руб.
Масло	7 000 руб.
Яйца (1 дес.)	1 150 - 1 800 руб.
Картофель	2 500 - 3 000 руб. за ведро
Капуста квашеная	700 - 1 000 руб.
Морковь	400 - 500 руб.
Лук	900 - 1 200 руб.
Свёкла	350 руб
Чеснок	150 - 250 руб. за головку
Помидоры	4 000 - 4 500 руб.
Огурцы	3 500 - 4 000 руб.
Яблоки	800 - 2 800 руб.
Апельсины	2 200 - 3 500 руб.
Мандарины	3 000 - 3 300 руб.
Лимоны	2 500 - 3 300 руб.
Киви	550 руб шт.
Гранаты	–
Бананы	2 000 руб.
Свинина	4 500 - 7 850 руб.
Говядина	–
Телятина	–
Сало свежее	3 900 руб.
солёное	4 800 руб.
Селёдка	3 200 руб.
Макаронные изделия	1 150 - 1 200 руб.
Гречка	1 200 - 1 600 руб.
Рис	1 100 - 1 300 руб.
Мука	2 000 руб (2кг)
Сахар	не продаётся
Постное масло (1 л)	1 900 - 2 500 руб
Мёд	12 000 руб.

КУРСЫ ОБМЕНА ВАЛЮТ
16.03.2004 г.

"Беларусбанк"		
	Покупка	Продажа
1 USD	2130	2170
1 EURO	2600	2720
1 ZL	530	565
1 RUR	73,5	76
"Белпромстройбанк"		
	Покупка	Продажа
1 USD	2140	2167
1 EURO	2622	2680
1 ZL	530	570
1 RUR	74,5	75,9
"Белагропромбанк"		
	Покупка	Продажа
1 USD	2130	2170
1 EURO	2600	2700
1 ZL	520	580
1 LAT	3900	4130
1 LIT	700	810
1 UAH	370	420
1 GBP	3900	4140
1 RUR	74	76
Нацбанк РБ		
1 USD	2151	
1 EURO	2644,44	
1 RUR	75,46	

ПРОИСШЕСТВИЕ

В ДОМЕ ХРАНИЛ ЦЕЛЫЙ АРСЕНАЛ ОРУЖИЯ

На прошлой неделе в среду, 10 марта, сотрудники Слонимского РОВД задержали 51-летнего слонимчанина, который у себя дома хранил четыре вида огнестрельного оружия

У мужчины были изъяты: пистолет ТТ 1939 года выпуска, пистолет "маузер" без номера, незарегистрированное охотничье ружье ИЖ-18, обрез охотничьего ружья, 3 единицы пневматического оружия, незарегистрированный газовый револьвер, 2 магазина к пистолету Макарова и 758 патронов различного калибра.

Источники происхождения оружия устанавливаются. Задержание мужчины произошло по оперативной информации уголовного розыска.

По факту хранения огнестрельного оружия ведется проверка.

Ольга ШИНКЕВИЧ

ПАМЯТЬ

СЕГОДНЯ ВЕТЕРАНЫ ОТДЫХАЮТ С ПОЛЬЗОЙ

Впервые за свою долгую жизнь участники слонимского хора ветеранов «Память» смогли познакомиться с наиболее полной на сегодняшний день в Беларуси коллекцией военной формы одежды.

Для этого они собрались в пятницу у КПП 11-ой механизированной бригады, где своих гостей уже ждал организатор музея старшина контрактной службы Михаил Харченко. Начал же экскурсию офицер-психолог Николай Гарматный. Он вкратце рассказал о бригаде, после чего все дружно отправились к основной цели — экспозиции музея.

На территории воинской части многие из ветеранов были не первый раз. Правда, было это давным-давно — сразу после войны бегали смотреть кино вместе с солдатами. Тогда это выглядело так: на плацу растягивали белое полотнище — и именно оно заменяло собой экран. Получался летний кинотеатр... А еще вспоминали, что на территории части раньше стоял костел.

Теперь ничего этого нет, остались лишь воспоминания. А лет через двадцать и об этом вспомнить будет некому. Наверное, и обмундирование прошедших времен, армий исчезнувших государств со временем стали бы (да и уже стали по большому счету) раритетами и коллекционной ценностью. Но нам повезло: единственный в Беларуси музей военной формы, знаков различия и обмундирования прописался в Слониме. И ветеранам из хора «Память» здесь было по-своему интересно. А прослушав на патефоне пластинку 40–50-ых годов, они и вовсе словно на несколько минут вернулись в дни своей молодости.

Фота Валерыя КАВАЛЕНКІ

▪ Старые граммофонные записи все слушали с удовольствием

Из музея делегация отправилась в учебный корпус. В классе подготовки танкистов ветераны узнали, сколько денег экономят государству практически уникальные тренажеры. К примеру, один учебный выезд экипажа на танке в реальных условиях стоит 1 200 долларов США. Каждый день так не поездишь, а тренажер дает практически идентичные навыки. И полевые выходы, тактические учения на местности полностью подтверждают это.

Так что экскурсия удалась, и ветераны, по их же словам, узнали много нового для себя.

А еще не так давно для хора был организован коллективный поход в Слонимский драмтеатр, где ветераны с удовольствием посмотрели спектакль «Семейный уик-энд», восхищались игрой актеров и сами получили большой заряд бодрости.

Кстати, сейчас хор «Память» на своеобразных каникулах, но пассивный отдых — не для наших ветеранов. А передышку участники хора заслужили после напряженного труда. Потому что в конце февраля «Память» приняла участие в областном фестивале ветеранских коллективов «Не стареют душой ветераны». В Росси (именно там прошел фестиваль) слонимский хор представил зрителям серьезную программу хоровых песен и две вокальные группы и выступил достойно. Этому успешному выступлению предшествовала огромная работа всего коллектива и неутомимого и требовательного художественного руководителя хора Казимира Деконского.

Тамара ПЕТЕЛИНА,
Валерий КОВАЛЕНКО

НАВІНЫ

АБМЕРКАВАЛІ КАНЦЭПЦЫЮ

11 сакавіка ў рамках міжнароднай праграмы падтрымкі Беларусі ў 2003—2004 гадах (IBB) у Гродне прайшоў семінар "Канцэпцыя ўстойлівага развіцця: перспектывы для Гродзенскага рэгіёна".

У семінары прынялі ўдзел прадстаўнікі аблвыканкама, выканкамаў усіх 17-ці раёнаў вобласці, а таксама сябры грамадскіх арганізацый.

Слонімшчыну на гэтым мерапрыемстве прадстаўлялі галоўны спецыяліст аддзела прамысловасці райвыканкама Ірына Лявонава і старшыня грамадскага аб'яднання "Воля да развіцця" Міхась Варанец.

Гутарка на семінары вялася ў трох кірунках: эканамічныя, сацыяльныя і экалагічныя аспекты стратэгіі ўстойлівага развіцця Гродзенскай вобласці ў гэтым годзе і на перспектыву.

Мікола КАНАНОВІЧ

УДАКЛАДНЕННЕ

АД ЗЯМЕЛЬНАГА ПАДАТКУ ВЫЗВАЛІЛІ НЕ ЎСІХ

У мінулым нумары "ГС" была змешчана інфармацыя пра рашэнне райсавета аб вызваленні ад зямельнага падатку жыхароў шэрага вёсак раёна.

Як патлумачыла работнік падатковай інспекцыі, такога рашэння дэпутаты не прымалі. У пералічаных вёсках, якія адносяцца да працанедастатковых тэрыторый, ад падатку на зямлю вызвалены не ўсе, а толькі пэўныя катэгорыі жыхароў. Іншым зямельны падатак трэба плаціць.

ШКОЛА

БЕСПЛАТНОЕ ОБРАЗОВАНИЕ ПО-НАШЕМУ

▪ **Янина МЕЛЬНИКОВА**

Не секрет, что сегодня денег в школах и детских садах катастрофически не хватает. Директора и завхозы головы ломают, как сделать хотя бы легкий косметический ремонт в классах, а о более серьезных вещах даже не мечтают. Хотя некоторые из них все же находят способ залатать скудный школьный бюджет.

Во многих школах города родители давно привыкли к школьным "взносам". В СШ №4 в последнее время, по словам позвонившей в редакцию "ГС" родительницы второклассника, ежемесячно дети должны приносить в школу по 1 000 рублей на нужды школы. О каких нуждах идет речь, родительница не знает. Ей сказали только, что решение о сборах принял родительский совет школы, а не администрация. И все бы еще ничего, да вот куда пойдут деньги, родителям не сообщают. А ведь если подсчитать количество учеников (их в школе 548) и умножить это число на тысячу рублей, сумма каждый месяц набирается неплохая.

При этом тот же родительский совет решил собрать с учеников школы еще по 10 условных единиц для покупки в школу новых компьютеров. "Для кого-то эта сумма может показаться незначительной, а для кого-то, — говорит родительница, — это огромные деньги! А ведь если мой ребенок их не сдаст, у него могут начаться проблемы: учительница при всех его отчитает, пристыдит, что у матери нет такой незначительной суммы".

Как пояснили корреспонденту "ГС" в школе, деньги эти действительно собирают с родителей, но все происходит только в добровольном порядке. Причина того, что администрация вынуждена обращаться за помощью к родителям, — почти полное отсутствие в школе самых элементарных вещей: даже мел выдается на класс по кусочку в целях строжайшей экономии. Нет в школе ни достаточного количества тряпок, ведер, нуждаются в ремонте крыши, водосточные трубы, забор. Причем, как оказалось, практика собирания денег с родителей распространена почти во всех школах города. Так, в гимназии №1 дети должны сдать 10 тысяч рублей на весь учебный год, в СШ №8 ученики сдают деньги на нужды школы два раза в год — по 5 тысяч рублей. При этом речь не идет о ремонте классов и других учебных помещений по окончании учебного года. На эти нужды родители соберут деньги в конце учебного года.

Как пояснила корреспонденту "ГС" председатель родительского совета школы №4 Татьяна Евдокимовна Дегиль, деньги эти небольшие, но на них можно было бы купить мячи в спортивный зал, ведра и перчатки для уборки территории. Но, несмотря на то что деньги решили собирать еще в сентябре, на конец февраля собрали только 153 тысячи рублей. Что с ними делать — решит тот же родительский совет вместе с попечительским советом школы. В попечительский совет входят представители предприятий-шефов школы — мясокомбината и льнозавода, а также частные предприниматели. Шефы, к сожалению, материальную помощь школе оказать не могут, вот и приходится выкручиваться. Татьяна Евдокимовна особо подчеркнула:

— Дело это добровольное, мы никого не принуждаем. И призываем никого не мерять платежеспособностью. И даже если кто-то из родителей посчитает, что сдал тысячу рублей напрасно, ее и сейчас можно забрать.

А по поводу покупки компьютеров Татьяна Дегиль подтвердила, что уже собраны деньги на покупку двух компьютеров, хотя в этом году их планировалось купить пять. Всего же в компьютерный класс школы нужно в два раза больше — 10 электронно-вычислительных машин. Деньги решили собирать со всех, кроме выпускников 9 и 11 классов. На такой шаг родители решили пойти от безысходности: школа третья в очереди на модернизацию класса информатики среди городских, а ведь есть еще и школы районные.

Вот такое "бесплатное" образование получается. Конечно, деньги, собранные родителями, идут не на зарплату учителям и даже не на покупку учебных принадлежностей. Но то, что дети и их родители вынуждены оплачивать даже мел и тряпки, наводит на грустные мысли: возможно, вскоре педагоги вынуждены будут вспомнить опыт школы военных лет и станут писать угольками на белой стене, потому что денег в родительских кошельках не больше, чем в бюджете образования. Тем временем в СШ №4 одна за другой приходят комиссии из санэпидемстанции, пожарной службы. Уже сегодня на столе в кабинете директора школы лежат предписания и протоколы со штрафами на 88 и 150 тысяч рублей. Причина все та же: в школе нет достаточного количества средств противопожарной защиты, да и просто ведер и тряпок. ▪

КУЛЬТУРА

"КАСКАД" ТАНЦУЕ І ПЕРАМАГАЕ


Фота Тацяны ПЛАХЕТКА

■ Кацярына Стралкоўская

У Мінску адбыўся трэці Міжнародны фестываль ансамбляў і шоу-груп. У ім прымаў удзел і ансамбль эстрадна-спартыўнага танца "Каскад" Слонімскага РДК. Калектыў выступіў даволі паспяхова і прывёз два кубкі і дыпломы. Наш карэспандэнт сустрэўся з кіраўніком ансамбля Кацярынай Стралкоўскай і папрасіў яе падзяліцца думкамі пра фестываль і планы свайго калектыву.

— Кацярына, скажыце, калі ласка, што гэта быў за фестываль і ці мае ён якое важкае значэнне ў маштабах, скажам, краін СНД?

— У нашай краіне існуе Беларуская ліга танца. Гэтая ліга штогод праводзіць розныя танцавальныя фестывалі і чэмпіянаты ў межах нашай рэспублікі і краін СНД. Гэтыя мерапрыемствы ўсе камерцыйныя і таму праводзяцца за кошт фундатараў ці за грошы бацькоў. У "Каскада" пакуль фундатараў няма, таму мы прымаем удзел ва ўсіх конкурсах і фестывалях за грошы бацькоў юных танцораў. Так было і на мінскім Міжнародным фестывалі. Праўда, аўтобус нам бясплатна выдзеліў раённы Дом культуры. Што да самога Міжнароднага фестывалю ансамбляў і шоу-груп, дык скажу, што гэта было даволі сур'ёзнае мерапрыемства і ў ім прымалі ўдзел танцавальныя калектывы краін СНД і Балтыі. Фестываль праходзіў у два этапы — адборачныя туры і фіналы. У фіналы прайшлі шэсць найлепшых калектываў у кожнай намінацыі. А ў гала-канцэрце бралі ўдзел толькі пераможцы.

— І "Каскад" аказаўся пераможцам?

— Так. Мы вазілі тры танцавальныя нумары — адзін танец у выкананні ювеналаў (гэта ўдзельнікі да 11 гадоў) і два танцы, якія паказвалі юніёры (ад 12 да 15 гадоў). Усе мы прайшлі ў фінал, два танцавальныя нумары сталі прызёрамі, а трэці танец заняў восьмае месца. Але і гэта таксама поспех, тым больш што там прымалі ўдзел каля 50 калектываў. Лепш за "Каскад" выступілі толькі ўкраінцы. І перамаглі яны за кошт шыкоўных касцюмаў. У нас, як заўсёды, ёсць праблемы з касцюмамі. Яны ўсё ж не адпавядаюць сучаснаму сцэнічнаму стылю і модзе. Дарэчы, Харкаўская абласная асацыяцыя сучаснага эстраднага танца нас запрасіла на свой падобны танцавальны фестываль. Цяпер шукаем фундатараў, можа, хто нам дапаможа з паездкаю на Украіну. Будзем удзячныя.

— Ці праўда, што падчас мінскага фестывалю да вас падыходзіла і цікавілася ансамблем кіраўнік расійскай групы "Тодэс" Ала Духава?

— Не, такога не было. Справа ў тым, што Ала Духава на фестываль у Мінск прыязджае праз год. Яна там была летась. І мы з ёю сустракаліся. Скажу толькі, што ў журы фестывалю сёлета былі спецыялісты па танцах з Беларусі, Расіі, Украіны і Літвы.

— Пасля фестывалю ансамбль адразу вярнуўся дамоў?

— Не, мы яшчэ прынялі ўдзел у тэлеперадачы " Сузор'е надзей".

— Што сабой сёння ўяўляе ансамбль эстрадна-спартыўнага танца "Каскад"?

— Сёлета ансамблю спаўняецца 12 гадоў. Ён налічвае каля ста чалавек розных узростаў: ад 4-ох да 18-ці гадоў. Са мною яшчэ працуе Алена Сяргееўна Бельская, якая вучыць танцаваць маленькіх хлопчыкаў і дзяўчынак. Былы кіраўнік ансамбля Зоя Данілаўна Пятроўская часова жыве і вучыць дзяцей танцаваць за межамі Беларусі. Але яна хутка павінна вярнуцца. А пакуль мы працуем удваіх.

— Кацярына, а як вы трапілі ў "Каскад"?

— З сёмага класа я займалася гімнастыкай у Зоі Данілаўны, а пасля паціху перайшла ў харэаграфію. Цяпер сумяшчаю працу з вучобаю, бо хачу атрымаць вышэйшую адукацыю.

— Як можна трапіць дзецям у "Каскад" і якія планы ў ансамбля?

— Набор у "Каскад" мы звычайна праводзім штогод у верасні. А што да планаў, дык у красавіку чакаем, што нас запросяць зноў на тэлебачанне на фінальны канцэрт тэлеперадачы "Сузор'е надзей". А таксама ў найбліжэйшы час плануем у Слоніме выступіць перад землякамі са справаздачнай танцавальнай праграмаю. Яна ўжо падрыхтаваная. Вось такія нашы справы.

Сяргей ЧЫГРЫН

■ "Каскад": фотаздымак на памяць

ГАДЫ І КНІГІ

"ШТРЫХІ З УСПАМІНАЎ" ВАСІЛЯ СУПРУНА

10 сакавіка старэйшаму слонімскаму паэту, гісторыку, краязнаўцу і даследчыку даўніны, ветэрану адраджэнцкага руху і вязню сталінскага ГУЛАГу (які, дарэчы, дагэтуль не рэабілітаваны ўладамі суверэннай Беларусі) Васілю Рыгоравічу Супруну споўнілася 78 гадоў.

Так атрымалася, што якраз да дня нараджэння пры падтрымцы маладзёжнага грамадскага аб'яднання "Ветразь" у Слоніме выйшла з друку кніга Васіля Супруна "Штрыхі з успамінаў". Наклад гэтага выдання зусім невялікі — усяго 30 асобнікаў. Падрыхтаваная да друку кніга была ў мінулым годзе.

Аўтар ва ўступным артыкуле піша: "Прыведзеныя ў гэтым выданні чарнавыя нататкі не прызначаліся для друку. Меркавалася, што яшчэ будзе магчымасць сур'ёзна папрацаваць і над успамінамі, і над сабранымі за жыццё навуковымі матэрыяламі. Ды, на жаль, не ўсё залежыць толькі ад нас і нашага жадання".

Жыццёвы лёс Васіля Супруна зусім не спрыяў літаратурнай творчасці і навуковай дзейнасці. І ўсё ж пачынаючы з 1993 года пабачылі свет такія кнігі Васіля Супруна, як паэтычны зборнік "Крык" (1993 г.), гісторыка-краязнаўчае выданне "За смугою часу" (1994 г.), паэтычныя зборнікі "Жыць для Беларусі" (1998 г.) і "Незабыўныя "ксівы" (1998 г.), а таксама краязнаўчыя кнігі "Дзеі над Шчарай" (2000 г.) і "100 пытанняў і адказаў з гісторыі Слонімшчыны" (2002 г.).

Як сцвярджае аўтар, за тыя гады, калі ў яго з'явілася магчымасць выступаць у друку і выдаваць кнігі, зроблена было вельмі мала. Чаму так сталася, Васіль Супрун якраз і тлумачыць у апошняй кнізе "Штрыхі з успамінаў". І хоць пісьменнік назваў свае ўспаміны толькі штрыхамі, па часе яны ахопліваюць перыяд з 1941-га да 2003-га года. На 130-ці старонках сваіх успамінаў і дакументаў аўтар досыць змястоўна расказвае пра часы акупацыі, пасляваенныя гады, дзейнасць падпольнай антысавецкай арганізацыі "Чайка", пра зняволенне, ГУЛАГ і жыццё пасля вызвалення з лагера цягам да нашых дзён. Праз лёс аўтара-героя ўспамінаў чытач мае магчымасць зазірнуць у гісторыю Слонімшчыны з часоў нямецкай акупацыі і да сённяшніх дзён. На такім лакальным прасторава-часавым прамежку прасочваецца жыццё рэгіёна, лёс канкрэтнага заходняга беларуса-інтэлігента і краіны наогул.

Для краязнаўцаў і даследчыкаў гісторыі краю кніга Васіля Супруна "Штрыхі з успамінаў" можа стацца зыходным пунктам для ўласнай працы.

Бо, як прызнаецца сам аўтар "Штрыхаў з успамінаў", у яго ўжо не хапае здароўя і сілаў для грунтоўнага даследавання і апрацоўкі нават сабраных матэрыялаў. Гады бяруць сваё.

Мікола КАНАНОВІЧ

НАКАНУНЕ

ПРОФСОЮЗАМ РАНО ЖИТЬ ВОСПОМИНАНИЯМИ

Профессиональные союзы — самая массовая общественная организация — в мае 2004 года будут отмечать свое 100-летие. Накануне этой даты Гродненский обком профсоюза работников местной промышленности и коммунально-бытовых предприятий провел 10 марта в Слониме семинар по обучению профсоюзного актива.

Примечательно, что на семинар пригласили и ветеранов — председателей профсоюзных комитетов прошлых лет. Эти люди, по мнению организаторов семинара, заслужили такое внимание к себе, потому что долгое время работали на профсоюзном поприще и оставили о себе самые добрые воспоминания.

По словам собравшихся на семинаре, приятной неожиданностью стала встреча с бывшим председателем отраслевого райкома профсоюза Лидией Владимировной Желиховской. Сейчас она живет и работает в Гродно, но не забывает Слоним. Здесь Лидия Владимировна благодаря уникальным организаторским способностям, деловым качествам и одновременно привлекательностью, доброжелательностью к людям сумела сплотить и сдружить активистов. И дружба эта продолжается до сих пор.

На семинаре профсоюзные ветераны делились опытом работы с молодежью, вспоминали прошлое, когда приходилось организовывать соцсоревнование, решать социально-бытовые вопросы, заботиться о соблюдении охраны труда и организации культурного отдыха членов профсоюза. И все же, оглядываясь назад, все признавали, что это было счастливое время.

Сейчас многие ветераны профсоюзного движения на заслуженном отдыхе, некоторые продолжают работать. И сегодня стоит назвать их поименно. Это Данута Викентьевна Сенкевич и Тамара Фадеевна Бурсевич (фабрика художественных изделий), Мария Васильевна Казак (фабрика «Текстильщик»), Мария Дмитриевна Соболева, Вера Николаевна Коваленко и Светлана Алексеевна Савчиц (горбыткомбинат), Галина Яковлевна Казачковская и Светлана Григорьевна Иванова (фабрика пухо-перьевых изделий), Любовь Николаевна Прокопчук (спецсовхоз «Рыщицы»), Фаина Васильевна Маркелова (фабрика гостиничной мебели). Продолжает работать в объединении жилищно-коммунального хозяйства Валентина Владимировна Панимасова. На днях она отметила свой 50-летний юбилей.

Председатель обкома профсоюза Зинаида Павловна Чеботарь выразила свою признательность нынешним председателям профкомов: Регине Михайловне Степуро (фабрика пухо-перьевых изделий), Ларисе Владимировне Гончарук (горбыткомбинат), Ольге Николаевне Герасимчик («Текстильщик»).

Слоним стал первым городом в Гродненской области, в котором обком профсоюза провел подобный семинар и встречу ветеранов. Впереди дружеские встречи, совмещенные с учебой в других городах области.

Валерий КОВАЛЕНКО

АРМИЯ

■ ВИА «Гвардия» полным составом в фойе ЦДО после отбора

"ГВАРДИЯ" ВЫСТУПИТ В ПРАЗДНИЧНОМ КОНЦЕРТЕ

В финальной конкурсной программе телевизионного фестиваля солдатской песни и праздничном концерте в честь Дня Победы примет участие вокально-инструментальный ансамбль «Гвардия» 11-ой гвардейской отдельной механизированной бригады из Слонима.

Это право наши ребята как победители регионального смотра-конкурса завоевали на отборе исполнителей и творческих коллективов в центральном Доме офицеров Вооруженных Сил Республики Беларусь.

На столичной сцене слонимская «Гвардия» исполнит песню «Ветераны».

Музыку и слова песни для военного вокально-инструментального ансамбля написал слонимский самодеятельный исполнитель Игорь Макарчук.

Валерий КОВАЛЕНКО
(фото Владимира ОСАДЧЕГО)

НОВОСТИ

СОТРУДНИКИ ТАМОЖНИ ИЗЪЯЛИ ДВЕ ИКОНЫ РОССИЙСКИХ МАСТЕРОВ

ГРОДНО. Две иконы российских мастеров конца XIX – начала XX века изъяли сотрудники Гродненской региональной таможни в пограничном пункте таможенного оформления (ППТО) "Брузги-2".

Как сообщили БелаПАН в пресс-службе Государственного таможенного комитета, нарушительницей оказалась неработающая жительница Гродно, которая выезжала из Беларуси в Польшу на легковом автомобиле "Форд-Скорпио".

Старший инспектор ППТО обратил внимание на "некоторое волнение гражданки при пересечении границы и провел более детальный осмотр автомобиля". В результате внутри спинки заднего сиденья "форда" были найдены иконы "Божья Матерь" в позолоченном обрамлении и "Божья Матерь. Знамение", предварительная стоимость которых оценивается в 1 миллион 800 тысяч рублей.

По данному факту был составлен протокол об административном таможенном правонарушении.

Алексей ОРЕШКО

ПАМЯЦЬ РАЁНА

ЗЭЛЬВА. Нядаўна ў Мінску ў выдавецтве "Паліграфафармлен-не" выйшла ў свет гісторыка-дакументальная хроніка "Памяць. Зэльвенскі раён".

Са старонак гэтага выдання можна даведацца пра гісторыю Зэльвеншчыны ад першабытных часоў да нашых дзён.

Кніга дае шырокую панараму народнага жыцця, апавядае пра цікавых людзей, лёс якіх звязаны з гэтым куточкам Беларусі. Сярод іх воіны, партызаны, спартоўцы, журналісты, паэты, настаўнікі, майстры народных рамёстваў. З гісторыка-дакументальнай хронікі можна даведацца пра архітэктурныя помнікі, якія знаходзяцца на тэрыторыі Зэльвенскага раёна, гісторыю населеных пунктаў Зэльвеншчыны, тэатр князёў Сапегаў у Дзярэчыне, пазнаёміцца з мясцовымі легендамі і паданнямі.

Фактычным матэрыялам для стварэння такога выдання паслужылі матэрыялы з дзяржаўных і ўласных архіваў, навуковыя даследаванні, публікацыі, успаміны людзей. У стварэнні летапісу Зэльвеншчыны зрабілі ўнёсак пісьменнікі, журналісты, супрацоўнікі музеяў, бібліятэк, архіваў, гісторыкі, краязнаўцы, прадстаўнікі органаў улады, ветэраны.

Наталля ГЛУШЭНЯ

МАСТАЦТВА

ГОЛАЕ ЦЕЛА І АПРАНУТАЯ ДУША

Творчасць гродзенскага мастака Антона Ляшчынскага, асабліва ягоныя эксперыменты з аголенай жаночай натурай, балансуе на мяжы кічу і эстэтычнай правакацыі.

Яе па-рознаму ацэньваюць у інтэлектуальным асяроддзі. Але кожныя «акты» аднязначна выклікаюць як абурэнне ў рэтраградаў і сучасных пурытанаў, так і шчырае недаўменне ў аматараў пікантнай «клубнічкі».

ЭРОТЫКА ЦІ ПАРНАГРАФІЯ?

Неяк у адной з тэлеперадач канала «Лад», прысвечанай «духоўнаму адраджэнню», з вуснаў вельмі заангажаванай у рэлігійную справу жанчыны прагучала надта красамоўная фраза. Маўляў, пакуль не передалі праваслаўнай царкве былога базыльянскага кляштара, у якім месціўся Гродзенскі абласны музей гісторыі рэлігіі, там ладзіліся парнаграфічныя выстаўкі! Аказалася, што шчырая верніца мела на ўвазе персанальную экспазіцыю Антона Ляшчынскага, зладжаную яшчэ ў 1992 годзе. Хто бы мог падумаць? Як ні дзіўна, але большасць твораў гэтага мастака нават не выпраменьвае так жаданага эратызму!

– Я не бачу ў творах Антона Ляшчынскага аніякай эротыкі, болей за тое – парнаграфіі, – заявіла адна з фотамадэлей мастака. – Каб мне гэта нагадвала што-небудзь такое, дык я б у яго не здымалася. Усе створаныя ім вобразы атрымліваюцца нейкімі ўзнёсла-аддаленымі і пазамежнымі...

Гэта пацвердзіла і другая персанальная выстава пад назвай «Мадэль і вобраз», што прайшла ў лютым 1996 года ў галерэі «У майстра». Тады мастак удала супрацоўнічаў з фатографам Міхалам Анішчанкам. Фотамадэль цалкам мела рацыю. Ані каліўца эратызму.

Поўная эстэтызацыя «цела як працоўнага матэрыялу». Мастацтва дзеля мастацтва, а не дзеля ўзбуджэння біялагічных функцый. Магчыма, вобразы тае выставы і падаліся, у адрозненне ад жывых прысутных мадэлей, нейкімі халаднаватымі і пазамежнымі, як бы з іншасвету. Але ж ад кожнай філасофіі вее нерэальным холадам...

ПАМІЖ ГРАФІКАЙ І ФАТАГРАФІЯЙ

– Я захапіўся фотамастацтвам, калі прыехаў на працу ў Гродна пасля заканчэння «худграфа» Віцебскага педінстытута, – успамінае Антон Ляшчынскі. – Гэта мяне як графіка падштурхнула да новых творчых пошукаў. Я, вядома, спрабаваў займацца жывапісам. Але зразумеў, што толькі ў графічных творах ёсць прыхаваная інтрыга і таямніца, якая адразу не заўважаецца, а спасцігаецца апасля. Гэта духоўны працэс, які больш важны за нейкія фармальныя пошукі...

Натуральна, мастацкага твора раптоўна і хутка не створыш. Асабліва калі няма таленту, замілавання і... адпаведнага тэхнічнага абсталявання. Бо сапраўднае фотамастацтва – апрача таго, што творчы, – даволі працаёмкі і каштоўны ў сённяшніх умовах занятак.

– Цяпер ужо не назіраецца імкнення да мастацкай фатаграфіі, – заўважае Антон Ляшчынскі. – Яе загубілі ўсе гэтыя «кодакі», «конікі» і «фуджы», якія канвеерным спосабам прадукуюць каляровыя шырспажываўскія фоткі, што з мастацтвам нічога агульнага не мае. Бо ў мастацкай фатаграфіі свая адметная спецыфіка, мова і збольшага графічная чорна-белая фактура. Гэта праца рук творцы, а не аўтамата!

Паводле Антона Ляшчынскага, мастак адчувае вялікую розніцу паміж маніпуляцыямі камп'ютэрнай мышкай і дакрананнем пэндзля да фактуры. Фатаграфічны вобраз ён пераасэнсоўвае і ўвасабляе ў графіцы. Або робіць асобныя працы алоўкам, іншыя – толькі фота. Ну і не абыходзіцца, зразумела, без сінтэзу чыстае графікі і фатаграфіі. Гэта можна было б назваць размаляванымі фотаздымкамі, але паспрабуй – разгадай таямніцу. А стварыць цуд на паперы дапамагае толькі майстэрства.

ГОЛАЕ ЦЕЛА Ў АБ'ЕКТЫВЕ

Сфатаграфаваць чалавека, каб хоць крыху адлюстраваць ягоны ўнутраны свет і каб глядач пасля ўбачыў адухоўленую асобу, вельмі складана. Гэты працэс для майстра патрабуе самааддачы і нервовага напружання. Але нічога для творцы дарэмна не праходзіць. Нават праца з такім далікатным матэрыялам, як чалавечая аголеная натура. Напэўна, кожны, хто бачыў працы Антона Ляшчынскага, задае пытанне: як і дзе маэстра адбірае свае мадэлі?

– Матэрыял для фотасесій адбіраецца спантанна, як пейзаж ці нацюрморт, – гаворыць мастак. – Збольшага гэта выпадковыя людзі. У нас жа няма фотамадэлей, ёсць звычайныя манекеншчыцы. Мала хто з жанчын адмаўляўся здымацца аголенымі. Тут чыстая псіхалогія. Проста трэба знайсці падыход да чалавека. Вось размаўляю з будучай мадэллю, паказваю папярэднія работы. Калі падабаецца – дык пачынаем супрацоўнічаць. Некаторыя самі прыходзяць у майстэрню і напрошваюцца здымацца. На вуліцах я да людзей з такімі прапановамі не чапляюся! (Смяецца).

Чаму ўсё ж аголеная натура? Не толькі дзеля прыцягнення ўвагі ці правакавання гледача. Каб быць прафесіяналам у фотамастацтве, трэба найперш мець рацыянальны розум і добрае абсталяванне. Тут мастак ужо не такі вольны, бо абмежаваны тэхнікай, без якой мастацкая фатаграфія немагчыма. У гэтых варунках вельмі важна, каб ідэя матэрыялізавалася ў адпаведнай форме.

– Фота мае магчымасць найбольш дакументальнага адлюстравання натуры, бо апарат фіксуе дакладна тое, што перад аб'ектывам, – тлумачыць Антон Ляшчынскі. – І фатаграфаванне жывога чалавека, асабліва аголенай натуры, – вельмі складаная справа. Пасля толькі ад мастака залежыць, як выявіць тую ці іншую чалавечую натуру. А яе можна паказаць гратэскна, як славак Ян Саўдэк, ці лірычна, як літовец Дзіхавічус. Галоўнае – падпарадкаваць халодную камеру свайму мастацкаму густу і погляду, каб выявіць канкрэтыку і праз адзінкавае паказаць тыповае. Гэта творча-інтымны працэс, размова без слоў пра патаемнае, глыбока асабістае, якое пасля фотасесіі можа ніколі не выявіцца і не раскрыцца...

ГАРНІТУР АД САШЫ ВАРЛАМАВА

У 2000 годзе Антона Ляшчынскага ўзнагародзілі дыпломам як пераможца ў намінацыі ФОТА Рэспубліканскага конкурса моды і фота «Супермадэль Беларусі–2000». Ягоныя працы страшэнна спадабаліся айчыннаму куцюр'е Сашу Варламаву, і мастака запрасілі «працаваць» з мадэлямі на конкурсах прыгажосці.

– Я гляджу на мадэль канкрэтна і прафесійна, мяне цікавіць арыгінальная фактура і прыгажосць, – прызнае Антон Ляшчынскі. – А на конкурсах прыгажосці заўсёды ёсць выбар і поле для манеўра...

Вось і 10 сакавіка ў Гродне адбылася прэзентацыя «Модныя казкі» ад Сашы Варламава, да якіх наш маэстра рабіў ілюстрацыі. Антон Антонавіч распавядае, што Варламаў паабяцаў заплаціць нейкі сімвалічны ганарар за працу.

– Але ж я рабіў здымкі не дзеля грошай, – кажа мастак. – І ў якасці ўзнагароды папрасіў Сашу Варламава пашыць мне арыгінальны гарнітур светла-кававага колеру. Вось хаджу, як большая частка мастакоў, у світэры. А так, у модным стылёвым гарнітуры, буду дзяўчатам больш падабацца! (Смяецца).

Юры ГУМЯНЮК,
pahonia.promedia.by

ЭКОНОМИКА

КПФ ОЗДОРОВИТ «БЕЛЛЕГПРОМ»

В концерне "Беллегпром" разработан Комплексный план действий предприятий по выполнению основных целевых параметров прогноза социально-экономического развития отрасли в 2004 году.



Фота з архіва "ГС"

■ Возможно, слонимская КПФ вновь заработает в полную силу

В план включены мероприятия по повышению конкурентоспособности продукции за счет обновления ассортимента, внедрения прогрессивных технологий и повышения технического уровня производства, сокращения затрат на производство. Кроме того, предусмотрено развитие маркетинга и товаропроводящей сети, а также совершенствование структуры промышленных предприятий отрасли.

Как сообщили БелаПАН в "Беллегпроме", в качестве основного приоритета развития легкой промышленности в этом году руководство концерна выбрало финансовое оздоровление отраслеобразующих текстильных предприятий концерна, от результатов работы которых зависит работа трикотажных и швейных предприятий. Речь идет о предприятиях «Слонимская камвольно-прядильная фабрика", "Барановичское производственное хлопчатобумажное объединение", "Гронитэкс", "Камволь". На каждом из них разработан бизнес-план развития, который будет рассматриваться руководством концерна.

БелаПАН

КРИМИНАЛ

БЕЛОРУССКИЙ СУД ОСУДИЛ РОССИЙСКОГО ОФИЦЕРА

Белорусский суд приговорил к 4 годам лишения свободы офицера российской армии Олега Веселовского, которого обвинили в незаконном хранении и контрабанде взрывчатых веществ и боеприпасов на территории этой страны.

По словам Геннадия Янковского, судьи Островецкого района Гродненской области, который вынес приговор россиянину, непосредственно в зале суда к Веселовскому была применена амнистия и срок наказания был сокращен до трех лет.

В соответствии с назначенным наказанием, Веселовский будет отбывать срок в исправительной колонии усиленного режима. Обнаруженные при таможенном досмотре вещи, среди которых, помимо боеприпасов и взрывчатых веществ, были два радиотелефона, цифровой фотоаппарат, электрошокер и деньги — 103 тысячи российских рублей — были у Веселовского конфискованы.

"После того как Веселовский отбудет наказание на территории Белоруссии, мы отдадим его в руки российской прокуратуры, которая предъявит ему свои обвинения, если не истекут сроки", — заявил Янковский.

Капитан одной из воинских частей Ленинградского военного округа Олег Веселовский был задержан сотрудниками госбезопасности Белоруссии в Гродненской области в ноябре 2003 года. Военная прокуратура России выясняет источник приобретения военнослужащим взрывчатки.

Газета.Ру

ПАЛІТЫКА

ГРАФ ПРУШЫНСКІ: «КАЛІ НЯМА ЛЕПШАГА, ПРЭЗІДЭНТАМ МАГУ БЫЦЬ Я!»

Па запрашэнні прадстаўнікоў незарэгістраванага аб'яднання «Гарадзенская ініцыятыва» Гродна наведаў скандальна вядомы граф Аляксандр Прушынскі.

У памяшканні Таварыства беларускай школы адбылася ягоная сустрэча з прадстаўнікамі грамадскіх арганізацый і палітычных партый.

Аляксандр Прушынскі з'яўляецца сапраўдным графам. Ён нарадзіўся ў 1934 годзе ў вёсцы Рагозніца Мастоўскага раёна. Ягоны дзед меў уласны палац. Пэўны час Аляксандр Прушынскі жыў у Польшчы, а потым ягоная сям'я эмігравала ў Канаду. У 1992 годзе ён вярнуўся ў Беларусь.

Аляксандр Прушынскі набыў скандальную вядомасць у 1994 годзе, калі, падчас прэзідэнцкай кампаніі, у яго не было грамадзянства Рэспублікі Беларусь, але ён паспрабаваў вылучыцца сваю кандыдатуру на пасаду кіраўніка краіны.

Граф Прушынскі мае вышэйшую эканамічную адукацыю і дэкларуе, што ведае, як вывесці Беларусь з крызісу.

— Шмат хто хоча з'ехаць у Канаду, а я вярнуўся, бо аптыміст па жыцці. Я веру, што ў нас атрымаецца стварыць цудоўную краіну, — заяўляе Аляксандр Прушынскі.

Пра тое, як зрабіць з Беларусі цудоўную краіну, дзе цякуць «малочныя рэкі з кісельнымі берагамі», Прушынскі напісаў кнігу «Еўрарамонт для Беларусі».

— Гэта мая праграма дзеяннняў, я не кажу, што ведаю ўсё, але я прапаную цэлую праграму... Калі няма нікога лепшага, прэзідэнтам магу быць я, — упэўнена заяўляе Прушынскі.

Аднак ці будзе Аляксандр Прушынскі прымаць удзел у прэзідэнцкіх выбарах, яшчэ невядома. Справа ў тым, што, як і ў 1994 годзе, Прушынскі не мае беларускага грамадзянства.

— Зразумела, што прэзідэнт павінен быць грамадзянінам сваёй краіны... Калі я вырашу, што трэба ісці на выбары, тады адмоўлюся ад канадскага і польскага грамадзянства, — дэкларуе Аляксандр Прушынскі.

Андрэй АДЛЯНІЦКІ, pahonia.promedia.by

НОВОСТИ

БЕРЕМЕННЫХ БУДУТ ПРЕМИРОВАТЬ

ГРОДНО. Помочь стране изменить демографическую ситуацию решили в поселке Гожа Гродненского района. Местный сельхозкооператив теперь будет премировать беременных женщин.

Рожать детей в поселке Гожа Гродненского района до сегодняшнего дня было делом не модным. В деревне, говорят в сельсовете, молодежь заводить семьи не торопится, детей рожать не хотят. Город близко, туда и тянет.

Мол, бытовые условия там получше, да и зарплата повыше, чем в местном сельхозкооперативе. Первым демографический кризис почувствовал на себе поселковый детский сад.

Он рассчитан по проекту почти на 100 детей, а пока их наполовину меньше.

Давать премию за каждого новорожденного в сельхозкооперативе "Гожа" решили потому, что в хозяйство уже два года не приезжали молодые специалисты. Коллектив стареет, рассказывает директор, молодежи в возрасте до 30 лет в поселке — всего 10 процентов.

